Дадатак 2

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## 1. Вучэбныя праграмы

У 2025/2026 навучальным годзе выкарыстоўваюцца вучэбныя праграмы, зацверджаныя ў 2025 годзе.

*Звяртаем увагу*, што колькасць вучэбных тыдняў у X класе з 2025/2026 навучальнага года скарацілася і складае 34 вучэбныя тыдні (п. 2 артыкула 150 новай рэдакцыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі).

У сувязі з гэтым у вучэбных праграмах адбыліся наступныя змены:

па вучэбным прадмеце **«Беларуская мова»**:

на вывучэнне вучэбнага прадмета на базавым узроўні адводзіцца 51 гадзіна (замест 53 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэм «Марфалагічныя нормы» – 15 гадзін (замест 16 гадзін), «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага» – 1 гадзіна (замест 2 гадзін);

на вывучэнне вучэбнага прадмета на павышаным узроўні адводзіцца 102 гадзіны (замест 105 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэмы «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага» – 2 гадзіны (замест 4 гадзін), колькасць рэзервовых гадзін – 1 гадзіна (замест 2 гадзін);

на вывучэнне вучэбнага прадмета на павышаным узроўні ў ліцэі (4 гадзіны на тыдзень) адводзіцца 136 гадзін (замест 140 гадзін); скарочаны вучэбны час на тэму «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага» – 4 гадзіны (замест 6 гадзін), колькасць рэзервовых гадзін – 2 гадзіны (замест 4 гадзін);

па вучэбным прадмеце **«Беларуская літаратура»**:

на вывучэнне вучэбнага прадмета на базавым узроўні адводзіцца 52 гадзіны (замест 53 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэмы «Гераіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі» – 2 гадзіны (замест 3 гадзін);

на вывучэнне вучэбнага прадмета на павышаным узроўні адводзіцца 102 гадзіны (замест 105 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэм «Гераіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі» – 5 гадзін (замест 6 гадзін), «Вацлаў Ластоўскі. Аповесць “Лабірынты”» (2 гадзіны) – выключана;

на вывучэнне вучэбнага прадмета ў ліцэі на базавым узроўні (пры вывучэнні вучэбнага прадмета на працягу аднаго навучальнага года ў X класе) адводзіцца 68 гадзін (замест 70 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэм «Уводзіны» – не вылучаецца асобная гадзіна (вывучэнне вучэбнага матэрыялу будзе адбывацца ў кантэксце раздзела «Даўняя літаратура»), «Якуб Колас. Трылогія “На ростанях” (частка першая “У палескай глушы”)» – 2 гадзіны (замест 3 гадзін);

на вывучэнне вучэбнага прадмета ў ліцэі на павышаным узроўні (4 гадзіны на тыдзень) адводзіцца 136 гадзін (замест 140 гадзін); скарочаны вучэбны час на вывучэнне тэм «Уводзіны» – 1 гадзіна (замест 2 гадзін), «Вацлаў Ластоўскі. Аповесць “Лабірынты”» (3 гадзіны) – выключана.

Усе вучэбныя праграмы размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова*, *Беларуская літаратура*.

## 2. Вучэбныя выданні

Электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале *(http://e-padruchnik.adu.by)*.

Да 2025/2026 навучальнага года перавыдадзены з улікам вынікаў вопытнай праверкі, дыялогавых пляцовак, грамадскай экспертызы наступныя падручнікі:

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова»**

Валочка, Г. М. Беларуская мова : падручнік для 6 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2025.

Валочка, Г. М. Беларуская мова : падручнік для 9 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2025.

У параўнанні з папярэднімі выданнямі з мэтай узмацнення выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Беларуская мова» падручнікі дапоўнены культуразнаўчымі тэкстамі, якія выкарыстоўваюцца на ўроках мовы ў якасці дыдактычнага матэрыялу і сваім зместам выхоўваюць у вучняў павагу да мовы, Радзімы, яе прыроды і людзей; садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці, патрыятызму, сістэмы маральна-этычных якасцей, паважлівых адносін да сямейных каштоўнасцей, павагі да гістарычнага мінулага і стваральнай працы на карысць беларускай дзяржавы.

Рэкамендацыі па рабоце з вучэбнымі дапаможнікамі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова*, *Беларуская літаратура*.

*Звяртаем увагу*, што пры арганізацыі адукацыйнага працэсу неабходна ўлічваць рэкамендацыі «Аб актуальных пытаннях выкладання

вучэбных прадметаў сацыяльна-гуманітарнага напрамку ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», размешчаныя на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні.

Інфармацыя аб вучэбна-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» да 2025/2026 навучальнага года размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова, Беларуская літаратура.

## 3. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбнага прадмета на павышаным узроўні

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучэбныя прадметы «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» могуць вывучацца на павышаным узроўні ў VIII і IX класах у аб'ёме не больш за дзве дадатковыя вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння беларускай мовы і літаратуры на павышаным узроўні размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова, Беларуская літаратура.

Пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ў X і XI класах на павышаным узроўні выкарыстоўваюцца электронныя дадаткі для павышанага ўзроўню: «Беларуская мова. 10 клас», «Беларуская літаратура. 10 клас», «Беларуская мова. 11 клас», «Беларуская літаратура. 11 клас», размешчаныя на рэсурсе http://profil.adu.by.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі адукацыйнага працэсу на павышаным узроўні ў X–XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова, Беларуская літаратура.

## 4. Асаблівасці тыпавога вучэбнага плана ліцэяў

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23.04.2025 № 75 «Аб тыпавых вучэбных планах агульнай сярэдняй адукацыі» зацверджаны тыпавы вучэбны план ліцэя. Па асобных вучэбных прадметах, якія вывучаюцца ў ліцэі на павышаным узроўні, устаноўлены

дыяпазон (ад мінімальнага да максімальнага) колькасці вучэбных гадзін пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» на павышаным узроўні. У сувязі з гэтым прапануецца размеркаванне вучэбных гадзін па раздзелах для вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова» на павышаным узроўні і вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» на базавым і павышаным узроўнях.

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова» (павышаны ўзровень)**

*Табліца*

| Клас | Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (4 гадзіны на тыдзень) |
|---|---|---|
| **X** | Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства | 2 |
| | Маўленне | 6 |
| | Тэкст | 6 |
| | Культура маўлення | 8 |
| | Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення | 32 |
| | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення | 19 |
| | Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення | 15 |
| | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення | 42 |
| | Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага | 4 |
| | Рэзервовыя гадзіны | 2 |
| | **УСЯГО** | **136** |
| **XI** | Агульныя звесткі пра мову | 2 |
| | Стылістыка | 8 |
| | Маўленчыя зносіны | 6 |
| | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення<br>*Словазлучэнне*<br>*Просты сказ*<br>*Складаны сказ. Чужая мова* | <br>13<br>48<br>47 |
| | Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага | 8 |
| | Рэзервовыя гадзіны | 4 |
| | **УСЯГО** | **136** |

**Вучэбны прадмет «Беларуская літаратура» (павышаны ўзровень)**

*Табліца 1*

| Клас | Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела пры вывучэнні вучэбнага прадмета 4 гадзіны на тыдзень |
|---|---|---|
| **X** | УВОДЗІНЫ | 1 |
| | ДАЎНЯЯ ЛІТАРАТУРА (XI–XVIII стст.) | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Літаратура эпохі Сярэдневякоўя | 2 |
| | | Кірыл Тураўскі. Словы. Казанні. Павучанні. Жыццё і літаратурна-асветніцкая дзейнасць К. Тураўскага. Пропаведзь маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства, крытыка чалавечых заган. Высокае паэтычнае майстэрства К. Тураўскага (метафарызм, красамоўства, багацце лексікі) | 2 |
| | | Літаратура эпохі Адраджэння | 2 |
| | | Францыск Скарына. Прадмова да ўсёй Бібліі, прадмова да Псалтыра і кнігі Іова (урыўкі) | 2 |
| | | Развіццё беларускага кнігадрукавання | 2 |
| | | Літаратура эпохі Барока | 2 |
| | | Літаратура эпохі Асветніцтва | 2 |
| | | РАЗВІЦЦЁ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX ст. | |
| | | Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст. | 2 |
| | | Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII – першай паловы XIX ст. як вядучы літаратурны напрамак (з абагульненнем раней вывучанага) | 2 |
| | | Ян Чачот. Вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча» | 2 |
| | | Францішак Багушэвіч. Паэма «Кепска будзе!»; апавяданне «Тралялёначка» | 4 |
| | | Янка Лучына. Верш «Роднай старонцы»; паэма «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» (ва ўрыўках) | 2 |
| | | Тарас Шаўчэнка. Вершы «Думка» («Цяжка-цяжка жыць на свеце...»), «Садок вішнёвы каля хаты...» | 1 |
| | | ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст. | |
| | | Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя | 2 |
| | | Цётка. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора»; апавяданне «Асеннія лісты» | 3 |
| | | Ядвігін Ш. Апавяданне «Дуб-дзядуля» | 2 |
| | | Янка Купала. Драма «Раскіданае гняздо» | 4 |
| | | Якуб Колас. Трылогія «На ростанях» (частка першая «У палескай глушы»); паэма «Сымон-музыка» | 8 |
| | | Максім Багдановіч. Вершы «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»; «Страцім-лебедзь» | 4 |
| | | Алесь Гарун. Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» | 1 |
| | | Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў: агляд | 2 |
| | | Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк, Міхась Машара, Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк і іншыя пісьменнікі) | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| | Максім Гарэцкі. Апавяданне «Літоўскі хутарок»; аповесць «Дзве душы» | 5 |
| | Змітрок Бядуля. Абразкі, лірычныя мініяцюры «Плач пралескаў», «Нібы рупны араты…»; апавяданне «Бондар» | 3 |
| | Уладзімір Дубоўка. Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца…», «Родная мова, цудоўная мова!», «Цягнік спяшаўся» | 2 |
| | Гіём Апалінэр. Вершы «Мост Мірабо», «Цень» | 1 |
| | Уладзімір Жылка. Вершы «Меч», «Палімпсест», «Мы любім дзіўныя паданні», «Беларусь», «Максім Багдановіч» | 2 |
| | Язэп Пушча. Вершы «Раніцу шчэбет пільнуе…», «Светлых дзён хараство», «Каплі вады», «Лісты да сабакі», «Лета» | 2 |
| | Кандрат Крапіва. Байкі «Дзед і баба», «Саманадзейны конь»; камедыя «Хто смяецца апошнім» | 5 |
| | Андрэй Мрый. Раман «Запіскі Самсона Самасуя» | 3 |
| | Міхась Зарэцкі. Апавяданні «Дзіўная», «Кветка пажоўклая» | 2 |
| | Стэфан Цвейг. Навела «Нябачная калекцыя» | 1 |
| | Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945). Агляд | 2 |
| | Гераіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі | 6 |
| | Кузьма Чорны. Апавяданне «Макаркавых Волька»; раман «Пошукі будучыні» | 7 |
| | Андрэ Маруа. Навела «Пакаранне золатам» | 1 |
| | Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965) | 2 |
| | Здабыткі ў жанры паэмы | 6 |
| | Пімен Панчанка. Вершы «Герой», «Толькі лісцем рабін шалахні...», «Родная мова», «Спарышы», «Той дзень прапаў і страчаны навекі…», «Крык сойкі», «Мала сказаць: ненавіджу…» | 4 |
| | Іван Мележ. Раманы «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» | 8 |
| | Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год | 2 |
| | Урокі па творах для дадатковага чытання | 3 |
| | Рэзерв вучэбнага часу | 2 |
| | Навучальныя і кантрольныя сачыненні | 12 |
| | **УСЯГО (у тым ліку на напісанне навучальных і кантрольных сачыненняў)** | **136** |
| **XI** | Беларуская літаратура перыяду 1960-х – пачатку 1990-х гадоў | |
| | Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гадоў. Агляд | 3 |
| | Іван Шамякін. Аповесць «Гандлярка і паэт»; раман «Сэрца на далоні» | 10 |

| | | |
|---|---|---|
| | Андрэй Макаёнак. П’еса «Зацюканы апостал» | 4 |
| | Янка Брыль. Апавяданне «Галя»; лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае» | 4 |
| | Васіль Быкаў. Аповесці «Сотнікаў», «Абеліск», «Знак бяды» | 12 |
| | Эрнэст Хемінгуэй. Аповесць «Стары і мора» | 2 |
| | Уладзімір Караткевіч. Вершы «Каложа», «Багдановічу», «Ты і я», «І тады закахалася хмара...»; раман «Чорны замак Альшанскі» | 10 |
| | Міхась Стральцоў. Апавяданні «Сена на асфальце», «На чацвёртым годзе вайны», «Смаленне вепрука» | 6 |
| | Ніл Гілевіч. Вершы «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...», «Паклон табе, мой беларускі краю!..»; раман у вершах «Родныя дзеці» | 5 |
| | Іван Чыгрынаў. Апавяданні «Дзівак з Ганчарнай вуліцы», «У ціхім тумане» («Маці») | 4 |
| | Іван Навуменка. Апавяданні «Сямнаццатай вясной», «Хлопцы самай вялікай вайны» | 4 |
| | Генрых Бёль. Раман «Дом без гаспадара» (ва ўрыўках) | 2 |
| | Рыгор Барадулін. Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…», «Пакуль жывеш, развітвайся з жыццём…» | 4 |
| | Алесь Разанаў. Вершы «Радзіма…», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Горад», «На гэтай зямлі», «Барана» | 4 |
| | Георгій Марчук. Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці», «Канон Школе» | 4 |
| | Аляксей Дудараў. П’еса «Князь Вітаўт» | 4 |
| | Міхась Башлакоў. Вершы «Дарогі Палесся», «Заркапад», «Рэха даўніх гадоў», «Не будзьце раўнадушнымі ніколі», «Тры лікі любові», «Музыка вясны», цыкл «Радзіма...» | 4 |
| | СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. АГЛЯД | |
| | Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе | 3 |
| | Паэзія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 8 |
| | Проза (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 11 |
| | Драматургія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 9 |
| | Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год | 2 |
| | Урокі па творах для дадатковага чытання | 3 |
| | Рэзерв вучэбнага часу | 2 |
| | Навучальныя і кантрольныя сачыненні | 12 |
| | **УСЯГО (у тым ліку на напісанне навучальных і кантрольных сачыненняў)** | **136** |

**Вучэбны прадмет «Беларуская літаратура» (базавы ўзровень)**

*Табліца 2*

| Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела пры вывучэнні вучэбнага прадмета 2 гадзіны на тыдзень толькі ў X класе | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела пры вывучэнні вучэбнага прадмета 2 гадзіны на тыдзень толькі ў XI класе |
|---|---|---|
| ДАЎНЯЯ ЛІТАРАТУРА (XI–XVIII стст.) | | |
| Уводзіны. Літаратура эпохі Сярэдневякоўя | 1 | 1 |
| Літаратура эпохі Адраджэння. Францыск Скарына. Прадмова да ўсёй Бібліі, прадмова да кнігі Псалтыр. Развіццё беларускага кнігадрукавання (Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя асветнікі) | 1 | 1 |
| Літаратура эпохі Барока. Літаратура эпохі Асветніцтва | 1 | 1 |
| РАЗВІЦЦЁ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX ст. | | |
| Агульная характарыстыка беларускай літаратуры XIX ст. | 1 | 1 |
| Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII – першай паловы XIX ст. як вядучы літаратурны напрамак (з абагульненнем раней вывучанага) | 1 | 1 |
| Ян Чачот. Вершы «Покуль сонца ўзыдзе...», «Да мілых мужычкоў», «На прыезд Адама Міцкевіча» | 1 | 1 |
| Францішак Багушэвіч. Паэма «Кепска будзе!» | 1 | 1 |
| ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст. | | |
| Беларуская літаратура пачатку XX ст. | 1 | 1 |
| Цётка. Вершы «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора» | 1 | 1 |
| Ядвігін Ш. Апавяданне «Дуб-дзядуля» | 1 | 1 |
| Янка Купала. Драма «Раскіданае гняздо» | 2 | 2 |
| Якуб Колас. Трылогія «На ростанях» (частка першая «У палескай глушы») | 2 | 2 |
| Максім Багдановіч. Вершы «Песняру», «Кніга», «Летапісец», «Мяжы», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» | 1 | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| Алесь Гарун. Вершы «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады» | 1 | 1 |
| Беларуская літаратура 1920-х – 1930-х гадоў: агляд | 1 | 1 |
| Максім Гарэцкі. Апавяданне «Літоўскі хутарок» | 1 | 1 |
| Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар» | 1 | 1 |
| Уладзімір Дубоўка. Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца…», «Родная мова, цудоўная мова!» | 1 | 1 |
| Кандрат Крапіва. Камедыя «Хто смяецца апошнім» | 2 | 2 |
| Міхась Зарэцкі. Апавяданне «Дзіўная» | 1 | 1 |
| Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945). Агляд | 1 | 1 |
| Героіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі | 1 | 1 |
| Кузьма Чорны. Раман «Пошукі будучыні» | 3 | 3 |
| Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965) | 1 | 1 |
| Пімен Панчанка. Вершы «Герой», «Родная мова», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы», «Крык сойкі» | 1 | 1 |
| Іван Мележ. Раман «Людзі на балоце» | 3 | 3 |
| БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960-х – ПАЧАТКУ 1990-х ГАДОЎ | | |
| Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х – пачатку 1990-х гадоў. Агляд | 1 | 1 |
| Іван Шамякін. Раман «Сэрца на далоні» | 2 | 2 |
| Андрэй Макаёнак. «Зацюканы апостал» | 2 | 2 |
| Янка Брыль. Лірычныя мініяцюры «Загадка», «Трохі пра вечнае» | 1 | 1 |
| Васіль Быкаў. Аповесць «Знак бяды» | 3 | 3 |
| Уладзімір Караткевіч. Раман «Чорны замак Альшанскі» | 3 | 3 |
| Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце» | 1 | 1 |
| Ніл Гілевіч. Вершы «Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...»; раман у вершах «Родныя дзеці» | 2 | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» | 1 | 1 |
| Іван Навуменка. Апавяданне «Сямнаццатай вясной» | 1 | 1 |
| Рыгор Барадулін. Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў…», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая…», «Чалавек не ўзнікае так…» | 1 | 1 |
| Алесь Разанаў. Вершы «Радзіма…», «Кожны народ мае…», «У крузе», «Спадчына», «Горад» | 1 | 1 |
| Георгій Марчук. Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці» | 1 | 1 |
| Аляксей Дудараў. П’еса «Князь Вітаўт» | 1 | 1 |
| Міхась Башлакоў. Верш «Заркапад», цыкл вершаў «Радзіма...» | 1 | 1 |
| СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. АГЛЯД | | |
| Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе | 1 | 1 |
| Паэзія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 1 | 1 |
| Проза (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 2 | 2 |
| Драматургія (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) | 1 | 1 |
| Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год | 1 | 1 |
| Урокі па творах для дадатковага чытання | 1 | 1 |
| Навучальныя і кантрольныя сачыненні | 6 | 6 |
| **УСЯГО (у тым ліку на напісанне навучальных і кантрольных сачыненняў)** | **68** | **68** |

*Звяртаем увагу*, што колькасць кантрольных і навучальных работ, на напісанне якіх адводзіцца асобны ўрок (асобныя ўрокі), пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» для ліцэяў вызначана ў Дадатку 4 да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні*.

**5. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу**

Звяртаем увагу, што з 1 верасня 2025 года ўступае ў сілу пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21 лютага 2025 года № 43, згодна з якой унесены змены ў пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2022 года № 184 «Аб атэстацыі вучняў пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі» і, адпаведна, у «Метадычныя ўказанні па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненні норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах» (далей – Метадычныя ўказанні). Па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»:

скарэкціраваны нормы ацэнкі слоўнікавага дыктанта (Табліца 2), тэкставага дыктанта (Табліца 3), творчых работ вучняў (Табліца 4) у частцы, якая прадугледжвае зніжэнне адзнакі вучням за дапушчаныя імі выпраўленні;

у Метадычных указаннях пункты 11–12 у заўвагах да табліц 2–3 выкладзены ў наступнай рэдакцыі:

*11. У кантрольных і тэматычных самастойных работах тры і больш выпраўленні лічацца за адну памылку.*

*12. За выпраўленні адзнака да нездавальняючай не зніжаецца.*

Метадычныя ўказанні («Беларуская мова») размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова*, *Беларуская літаратура*.

**Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў**

Звяртаем увагу, што Дырэктывай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 ад 9 красавіка 2025 года «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» зацверджаны асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Адукацыя вызначана адной з прыярытэтных сфер, у якіх ідэалагічная работа знаходзіцца пад асобым кантролем дзяржавы.

Рэалізацыя ў адукацыйным працэсе выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» будзе садзейнічаць рашэнню асноўных задач ідэалагічнай работы, сярод якіх – прапаганда дасягненняў Рэспублікі Беларусь ва ўсіх галінах жыцця, выхаванне патрыятызму, стымуляванне актыўнага ўдзелу ў захаванні гістарычнай памяці і нацыянальных каштоўнасцей; павышэнне прававой, палітычнай, асабістай культуры і сацыяльнай адказнасці; выхаванне маральна-псіхалагічных якасцей, якія матывуюць на рашэнне задач паспяховага развіцця краіны.

Патрыятычнае выхаванне **на ўроках беларускай мовы** рэалізуецца праз прывіццё любові і павагі, свядомага стаўлення да мовы як духоўнай каштоўнасці, сродку зносін і атрымання ведаў у розных сферах чалавечай дзейнасці. Асаблівай увагі патрабуюць асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці, фарміраванне ўсвядомленага ўспрымання вучнямі беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання традыцый, маральных ідэалаў грамадства; фарміраванне ў вучняў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

Багатым выхаваўчым патэнцыялам валодаюць культуразнаўчыя тэксты, якія выкарыстоўваюцца на ўроках мовы ў якасці дыдактычнага матэрыялу. Падчас працы з такімі тэкстамі мэтазгодна праз каментарый або аналіз зместу **звяртаць увагу** вучняў на факты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа: традыцыі, мараль, побыт, жыццёвую філасофію, каштоўнасці, нацыянальныя сімвалы і інш. Асаблівую ўвагу варта засяродзіць на знакавых падзеях гісторыі Беларусі, якія сведчаць пра гераічнае мінулае краіны, подзвігі герояў Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Пры падборы дыдактычнага матэрыялу да вучэбных заняткаў рэкамендуецца аддаваць перавагу такім практыкаванням і заданням, якія сваім зместам выхоўваюць у вучняў любоў і павагу да мовы, Радзімы, яе прыроды; спрыяюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці, патрыятызму, павагі да гістарычнага мінулага народа.

З мэтай рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета рэкамендуецца выкарыстоўваць актыўныя метады і формы навучання (арганізацыя гутарак, публічных выступленняў, дыскусій, дыспутаў па праблемных пытаннях, сітуацыях; падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў; стварэнне тэкстаў пэўнага стылю і жанру, тэкстаў на адну тэму ў розных стылях маўлення; напісанне работ даследчага характару і інш.). Варта выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі беларускай мовы з літаратурай і іншымі вучэбнымі прадметамі, акцэнтаваць увагу на ідэях, якія фарміруюць патрыятызм і грамадзянскасць.

Прыярытэтнай задачай **урокаў беларускай літаратуры** з’яўляецца фарміраванне ў вучняў патрыятычных каштоўнасных арыентацый, павагі да гістарычнага мінулага. Важная роля ў яе вырашэнні адводзіцца літаратурнай адукацыі ў сувязі з бясспрэчнымі выхаваўчымі магчымасцямі мастацкай літаратуры, якая дапамагае выхоўваць эмпатыю, крытычнае мысленне, грамадзянскую адказнасць, рабіць усвядомлены маральны выбар. Асаблівую ўвагу неабходна надаваць творам патрыятычнага і грамадзянскага зместу. Перш за ўсё гэта творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Подзвіг нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, усё ім перажытае і здзейсненае, бязмежная мужнасць, патрыятычная

самаахвярнасць, уменне перамагаць – гэта маральны капітал, з якога новыя пакаленні чэрпаюць духоўную сілу, асэнсоўваюць бясспрэчную каштоўнасць мірнага неба над галавой.

У гэтым кантэксце неабходна актыўна выкарыстоўваць на ўроках экранізацыю мастацкіх твораў, якія выклікаюць асаблівы эмацыянальны водгук у вучняў, паралельнае вывучэнне твораў патрыятычнага зместу беларускай і рускай літаратур.

Пры вывучэнні мастацкіх твораў, у якіх расказваецца пра пакуты людзей на вайне («Васількі» Міхася Лынькова, «Над спаленай вёскай…» Аркадзя Куляшова, «Незагойная рана» Васіля Быкава, «Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага), а таксама пры правядзенні пазакласнай работы па вучэбным прадмеце неабходна звяртаць увагу на праблему **генацыду** беларускага народа з апорай на гісторыі ўласных сем’яў вучняў, дакументальныя факты (напрыклад, «Хатынскі спіс», кнігі серыі «Памяць»).

Важна, каб у працэсе такой работы маладое пакаленне беларусаў разумела неабходнасць захавання памяці пра ахвяр **генацыду**, а таксама беражлівых адносін да гістарычнага мінулага, захавання міру і каштоўнасці стваральнай працы. Пры гэтым трэба ўлічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці вучняў.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» неабходна кіравацца інструктыўна-метадычным пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб вывучэнні ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі матэрыялаў аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» *(https://adu.by/ Галоўная / Інфармацыя для педагогаў / Расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа)*.

На ўроках беларускай літаратуры рэкамендуецца:

пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў акцэнтаваць увагу на тых момантах, якія дэманструюць вучням узор паводзін Чалавека і Грамадзяніна, Працаўніка і Барацьбіта за мір;

пры аналізе літаратурнага твора звяртаць увагу вучняў на словы і ўчынкі літаратурных герояў, якія ілюструюць гуманныя адносіны да навакольнага свету (беражлівыя адносіны да прыроды, культурнай спадчыны краіны); прававую і маральную культуру (выкананне законаў і захаванне маральных норм, усведамленне агульначалавечых каштоўнасцей); грамадзянска-патрыятычную пазіцыю (паважлівыя адносіны да гісторыі і культуры сваёй краіны, жаданне прынесці ёй карысць); паважлівыя адносіны да працы, імкненне павышаць свой узровень адукацыі і г. д.

Пры вывучэнні літаратурных твораў рэкамендуецца ўключаць вучняў у розныя віды дзейнасці, прапаноўваць ім разнастайныя заданні,

накіраваныя на аналіз жыццёвых сітуацый, у якіх апынуліся літаратурныя героі, прынятых героямі рашэнняў. Важна, каб пры гэтым вучні давалі маральна-этычную ацэнку ўчынкам і падзеям, усведамлялі і прымалі (або не прымалі) духоўна-маральныя ідэалы герояў; знаходзілі ў мастацкіх творах арыенціры для ўласных паводзін у розных жыццёвых абставінах. Праз адкрыты дыялог, творчыя праекты трэба вучыць разумець чалавечыя каштоўнасці, супрацьстаяць негатыўным стэрэатыпам, знаходзіць рашэнні ў складаных жыццёвых сітуацыях.

Неабходна ўлічваць, што асноватворным падмуркам любога ўрока літаратуры з'яўляецца непасрэдная праца з тэкстам мастацкага твора, які становіцца адпраўным пунктам у працэсе бесперапыннага выхавання.

Для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета ў працэсе работы з мастацкім творам прапануецца выкарыстоўваць:

заданні, арыентаваныя на практычную дзейнасць і сувязь са штодзённым жыццём (параўнальны аналіз пейзажных карцін у мастацкім творы і навакольнай прыроды; ліст ветэрану, заснаваны на ўражанні аб вывучаным творы пра Вялікую Айчынную вайну; дыспут пра маральны выбар герояў твораў; стварэнне інтэрнэт-старонак, прысвечаных памятным падзеям, апісаным у літаратурных творах);

заданні, якія дазваляюць звязаць вывучаемы матэрыял з асабістым сацыяльным вопытам і ўяўленнямі пра паводзіны людзей у грамадстве (інсцэніраванне фрагментаў мастацкіх твораў з наступным абмеркаваннем; стварэнне альтэрнатыўных сюжэтных ліній, фіналаў твораў з улікам змен у характары герояў, іх учынках; літаратурныя віктарыны, эстафеты, конкурсы; падрыхтоўка літаратурнай экскурсіі);

заданні, накіраваныя на выяўленне асобасных адносін вучняў да мастацкага твора, яго герояў (маляванне героя, падбор ілюстрацый, стварэнне вокладкі для кнігі, дзённікавых запісаў героя, падрыхтоўка эмацыянальнай партытуры настрою героя, складанне дыягнастычнай карты паводзін героя і інш.);

інтэрактыўныя формы работы: дыскусіі, ролевыя гульні і іншыя.

На ўроках беларускай літаратуры асаблівую ўвагу неабходна надаваць развіццю культуры маўлення вучняў, уменню карэктна ставіцца да іншых меркаванняў, праяўляць паважлівыя адносіны да суразмоўцаў.

Улічваючы вялікі выхаваўчы патэнцыял экскурсій, значную колькасць экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў мясцовага значэння, рэкамендуецца прадоўжыць выкарыстанне гэтай формы работы з улікам прынцыпу тэрытарыяльнай даступнасці. З гэтай мэтай распрацаваны Пералік экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў, якія рэкамендуюцца для наведвання вучнямі ў рамках правядзення вучэбных і факультатыўных заняткаў, пазакласных мерапрыемстваў з улікам зместу вучэбных праграм па вучэбных прадметах.

Эфектыўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца правядзенне ўрокаў у музеі. Урокі могуць праходзіць на базе музейных экспазіцый з экскурсійным суправаджэннем супрацоўнікаў музеяў. З улікам зместу дзеючых музейных экспазіцый распрацаваны пералік тэм для правядзення вучэбных заняткаў у форме экскурсій.

Названыя вышэй пераліках размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні*.

**Фарміраванне ў вучняў функцыянальнай адукаванасці**

З 2023 года ў Беларусі праводзіцца нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі, накіраванае на дыягностыку сфарміраванасці функцыянальнай адукаванасці вучняў. У лістападзе-снежні 2025 года плануецца правядзенне рэпетыцыйнага даследавання, асноўнай мэтай якога з'яўляецца падрыхтоўка вучняў да маштабнага даследавання ў 2026 годзе.

Фарміраванне ў вучняў функцыянальнай адукаванасці сродкамі вучэбнага прадмета прадугледжвае развіццё здольнасцей выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для вырашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці, зносін і сацыяльных адносін.

Працэс фарміравання функцыянальнай адукаванасці патрабуе ад настаўніка выкарыстоўваць метады і прыёмы навучання, якія дазваляюць развіваць ініцыятыўную, самастойную і творчую асобу (напрыклад, аналіз праблемнай сітуацыі, мазгавы штурм, доказ гіпотэзы (здагадкі), дыскусія, дэбаты, публічнае выступленне і іншае).

Важным сродкам фарміравання функцыянальнай адукаванасці з'яўляюцца практычныя задачы, заснаваныя на мадэляванні жыццёвых сітуацый. Для іх вырашэння вучням патрабуецца прымяняць міждысцыплінарныя веды, крытычнае і крэатыўнае мысленне, уменні працаваць з інфармацыяй, а таксама іншыя ключавыя кампетэнцыі. Прыклады падобных заданняў уключаны ў дапаможнікі серый «Вучымся вучыцца» і «Вучымся думаць і дзейнічаць».

Падрыхтавана серыя вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) факультатыўных заняткаў па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці вучняў праз арганізацыю праектнай дзейнасці. ВМК гэтых факультатыўных заняткаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: *https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Вучэбна-метадычныя комплексы факультатыўных заняткаў па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці вучняў*.

Карысная інфармацыя па фарміраванні ў вучняў функцыянальнай адукаванасці (навукова-метадычныя публікацыі па пытаннях фарміравання і ацэнкі функцыянальнай адукаванасці, памяткі для навучэнцаў і бацькоў, трэніровачныя заданні і іншае) размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Главная / Национальное исследование качества образования. Выконваць трэніровачныя заданні можна на платформе https://niko.unibel.by.

Для правядзення **факультатыўных заняткаў** неабходна выкарыстоўваць вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова, Беларуская літаратура.

Нагадваем, што ў VI–XI (XII) класах да канца I чвэрці, а ў V класе на працягу першага паўгоддзя захоўваецца аб’ём тэкстаў кантрольных работ, рэкамендаваны для папярэдняга класа; у першым паўгоддзі ў V класе праводзяцца толькі навучальныя пераказы.

Рэкамендуецца сістэматычна арганізоўваць навучанне вучняў напісанню падрабязнага пераказу ў V–IX класах і выкананню тэставых работ у VIII–XI класах на працягу ўсяго навучальнага года, а таксама выкарыстоўваць з гэтай мэтай рэзервовыя гадзіны.

Метадычныя рэкамендацыі па напісанні падрабязнага (навучальнага, кантрольнага) пераказу па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні.

Метадычныя рэкамендацыі па складанні і ацэньванні тэставых работ і спасылка на адкрыты банк тэставых матэрыялаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Метадычныя рэкамендацыі, указанні.

Звяртаем увагу, што пісьмовыя работы па беларускай літаратуры ў V–VIII класах носяць навучальны характар. Адзнакі за навучальныя сачыненні па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» выстаўляюцца толькі па літаратуры з улікам маўленчага афармлення.

На вучэбных занятках па беларускай літаратуры для работы з тэкстамі варта выкарыстоўваць выданні серыі «Школьная бібліятэка» (спіс серыі кніг «Школьная бібліятэка» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс.

2025/2026 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Беларуская мова, Беларуская літаратура).

Пры планаванні і арганізацыі пазакласнай работы па беларускай мове і літаратуры рэкамендуецца **звярнуць увагу на каляндар юбілейных дат і святочных дзён**, якія будуць адзначацца ў 2025/2026 навучальным годзе.

***Каляндар юбілейных дат, якія будуць адзначацца ў 2025/2026 навучальным годзе:***

| | |
|---|---|
| *лістапад:* | 105-годдзе з дня нараджэння Андрэя Макаёнка<br>95-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча |
| *студзень:* | 105-годдзе з дня нараджэння Івана Шамякіна |
| | 90-годдзе з дня нараджэння Янкі Сіпакова |
| | 75-годдзе з дня нараджэння Міхася Пазнякова |
| *люты:* | 105-годдзе з дня нараджэння Івана Мележа |
| | 60-годдзе з дня нараджэння Алеся Бадака |
| *сакавік:* | 130-годдзе з дня нараджэння Кандрата Крапівы |
| *красавік:* | 140-годдзе з дня нараджэння Змітрака Бядулі |
| | 75-годдзе з дня нараджэння Міхася Башлакова |
| *чэрвень:* | 80-годдзе з дня нараджэння Генрыха Далідовіча |
| *ліпень:* | 230-годдзе з дня нараджэння Яна Чачота |
| | 150-годдзе з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч) |

***Каляндар святочных дзён:***

1 верасня – Дзень ведаў
7 верасня – Дзень беларускага пісьменства
15 верасня – Дзень бібліятэк
21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы
3 сакавіка – Сусветны дзень пісьменніка
21 сакавіка – Сусветны дзень паэзіі
27 сакавіка – Сусветны дзень тэатра
2 красавіка – Міжнародны дзень дзіцячай кнігі
18 мая – Міжнародны дзень музеяў
25 мая – Дзень філолага

**6. Дадатковыя рэсурсы**

Карысную інфармацыю пры падрыхтоўцы да вучэбных заняткаў можна знайсці на наступных **інтэрнэт-рэсурсах**:

*http://edu.gov.by* – Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

*https://adu.by* – нацыянальны адукацыйны партал;

*http://www.belarus.by/ru/travel/heritage* – афіцыйны сайт Рэспублікі Беларусь;

*https://www.belstat.gov.by* – Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь;

*https://www.nlb.by* – Нацыянальная бібліятэка Беларусі;

*http://www.kupalauski.by* – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы;

*http://bellit.museum.by/be* – Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры;

*http://bagdanovich.museum.by* – Літаратурны музей Максіма Багдановіча;

*http://www.yakubkolas.by* – Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа;

*http://www.kupala-museum.by* – Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы;

*https://zviazda.by* – рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом “Звязда”»;

*http://boxapps.adu.by* – інтэрактыўныя дыдактычныя матэрыялы па вучэбных прадметах.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу можна выкарыстоўваць **адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс** *(https://eior.by)*.

## 7. Арганізацыя метадычнай работы

У план работы метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры (школы маладога настаўніка, творчых і праблемных груп, школьнага, раённага (гарадскога) вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» і інш.) у 2025/2026 навучальным годзе прапануецца ўключыць актуальныя пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» і методык выкладання вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура». У кантэксце падрыхтоўкі да нацыянальнага даследавання якасці адукацыі ў 2026 годзе рэкамендуецца прадоўжыць работу па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

Дзейнасць метадычных фарміраванняў трэба планаваць на аснове аналізу вынікаў метадычнай работы за папярэдні навучальны год з улікам прадметна-метадычнага ўзроўню і кваліфікацыі настаўнікаў, іх прафесійных інтарэсаў і запытаў.

На жнівеньскіх прадметных секцыях настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуецца абмеркаваць наступныя пытанні:

1. Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі ў 2025/2026 навучальным годзе:

навацыі ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

асаблівасці выкарыстання адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурса (*https://eior.by*) у адукацыйным працэсе па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура»;

эфектыўнасць выкарыстання ў адукацыйным працэсе кампанентаў вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура»;

электронныя дадаткі да вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», размешчаныя на інтэрнэт-рэсурсе «Профільнае навучанне» (*http://profil.adu.by*): мэтавае прызначэнне, магчымасці выкарыстання пры вывучэнні адпаведных вучэбных прадметаў у X і XI класах на павышаным узроўні.

2. Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу:

стварэнне бяспечных умоў арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры;

рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай мовы і літаратуры;

рэалізацыя міжпрадметных сувязей.

3. Аналіз вынікаў экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

4. Цэнтралізаваны экзамен па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі: аналіз вынікаў і напрамкі ўдасканалення падрыхтоўкі вучняў.

5. Падрыхтоўка вучняў да рэпетыцыйнага нацыянальнага даследавання якасці адукацыі.

6. Рэалізацыя задач Года добраўпарадкавання ва ўстановах адукацыі і на прылеглай тэрыторыі.

7. Аналіз вынікаў работы вучэбна-метадычнага аб'яднання і іншых метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў 2024/2025 навучальным годзе. Планаванне работы метадычных фарміраванняў на 2025/2026 навучальны год.

На працягу навучальнага года на пасяджэннях метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуецца разгледзець тэарэтычныя і практычныя аспекты выхавання і развіцця асобы вучня, пытанні методыкі выкладання вучэбных прадметаў з улікам эфектыўнага педагагічнага вопыту настаўнікаў рэгіёна:

развіццё навыкаў аналітычнай працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры для фарміравання эмацыянальнага і сацыяльнага інтэлекту вучняў;

праектаванне вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры з выкарыстаннем сучасных метадаў і сродкаў навучання, розных формаў арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння, накіраваных на выхаванне і развіццё асобы вучняў;

функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця чытацкай адукаванасці вучняў;

рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай мовы і літаратуры для фарміравання ў вучняў праз змест вучэбнага матэрыялу сістэмы маральных каштоўнасцей, сацыяльна адобраных паводзін, спосабаў прадуктыўнай камунікацыі;

асаблівасці рэалізацыі міжпрадметных сувязей беларускай мовы і літаратуры пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;

асаблівасці працы з нізкаматываванымі вучнямі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры;

фарміраванне навыкаў самастойнай вучэбнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры;

праектаванне сучаснага ўрока з пазіцыі сістэмна-дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання;

выкарыстанне лічбавых тэхналогій для арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку тэхналогій штучнага інтэлекту;

рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў беларускай мовы і літаратуры праз раскрыццё ролі літаратуры і мастацтва ў развіцці беларускай дзяржаўнасці;

факультатыўныя заняткі як форма дыферэнцыяцыі навучання вучняў беларускай мове і літаратуры.

Падрабязная інфармацыя аб курсавых і міжкурсавых мерапрыемствах, рэкамендацыі па змесце і арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2025/2026 навучальным годзе будуць размешчаны на сайце дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі» (*https://www.akademy.by/ Актуальныя матэрыялы / Аб Акадэміі / Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў перыяд паміж павышэннямі кваліфікацыі*).

Навукова-інфармацыйную і арганізацыйна-метадычную дапамогу настаўнікам беларускай мовы і літаратуры аказваюць **часопісы** «**Беларуская мова і літаратура**», **«Роднае слова»** (дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»). Часопісы знаёмяць з новымі тэхналогіямі правядзення ўрокаў, публікуюць лепшыя

распрацоўкі ўрокаў па беларускай мове і літаратуры, надаюць увагу пытанням кантролю ведаў, уменняў вучняў і падрыхтоўкі да прадметных алімпіяд, пазакласнай работы.